Хочаце быць у курсе ўсіх падзей?
*Афармляйце **перадаплату** за нумары «Народнай волі»*
першай паловы 2008 года

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

№№205–206
(2725–2726)

27 снежня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ПРЫКЛАД

Магілёўскія дэпутаты аддалі свае льготы донарам.

Ці будзе падтрымана гэтая ініцыятыва?

Дэпутаты Магілёўскага гарсавета прынялі рашэнне аб захаванні для донараў бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце.

— Вельмі цяжкім было змаганне за нашу "магілёўскую" льготу, толькі так яе можна назваць. Мы правялі шырокую кампанію, якая ўключала ў сябе шматлікія інфармацыйныя, прэзентацыйныя і страйкавыя акцыі з мэтай паінфармаваць грамадства аб тым, кім з'яўляюцца донары для медыцыны і для ўстаноў аховы здароўя і наколькі рызыкоўна застацца без іх дапамогі, —паведаміў нефармальны лідэр магілёўскіх донараў, актывіст ствараемага руху "За Свабоду" Ігар Каваленка. — Дэпутаты Магілёва адмовіліся ад сваіх ільготаў на бясплатны праезд і вярнулі іх донарам. І гэта быў вельмі сур'ёзны і важны крок з іх боку. Мы вельмі рады, што яны прынялі такое рашэнне.

Ігар Каваленка не губляе аптымізму, мае і намер змагацца далей, дамагаючыся вяртання права на 50-працэнтную скідку на лекі і зубапратэзіраванне.

СУД

«Адзін з самых ганебных палітычных судоў за час кіравання Лукашэнкі»

22-гадовага актывіста незарэгістраванага руху "Малады фронт" Артура Фінькевіча асудзілі на паўтара года зняволення.

Судовы працэс над Фінькевічам аказаўся вельмі хуткім. Справа была разгледжана за адзін дзень.

Разглядала справу маладзёжнага актывіста суддзя Магілёўскага гарадскога суда Наталля Крашкіна. Фінькевічу было прад'яўлена абвінавачанне, прадугледжанае 415 артыкулам Крымінальнага кодэксу (ухіленне ад адбыцця пакарання). Справа ў тым, што яшчэ ў 2006 годзе Артура Фінькевіча асудзілі за палітычныя графіці. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў на сценах дамоў з'явіліся надпісы "Дастаў", "Мы хочам новага" і іншыя, аўтарства якіх суд прызнаў за маладзёжным актывістам. Фінькевіча асудзілі на два гады "хіміі". Пакаранне юнак адбываў у Магілёўскай спецкамендатуры.

Тэрмін пакарання Фінькевіча павінен быў скончыцца 9 снежня, аднак у кастрычніку Артура абвінавацілі ў парушэнні рэжыму, завялі крымінальную справу і змясцілі ў Магілёўскі следчы ізалятар.

У дзень суда, з мэтай падтрымаць Фінькевіча ў Магілёў прыехалі дзесяткі сяброў і паплечнікаў. Сярод іх былі заўважаны Аляксандр Мілінкевіч, Іна Кулей, прадстаўнікі дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі. Месца ў судовай зале хапіла далёка не ўсім жадаючым. Справа ў тым, што пэўную частку месц у судовай зале занялі навучэнцы мясцовага юрыдычнага каледжа.

Артура Фінькевіча не сталі змяшчаць у клетку, дзе звычайна падчас судовага разбіральніцтва знаходзяцца падазроныя. Артур знаходзіўся ў глядацкай зале. Прысутныя адразу ж прыкмецілі дрэнны стан Фінькевіча. Артур схуднеў і выглядаў вельмі слабым... Ён заявіў, што напярэдадні судовага разбіральніцтва яму стала дрэнна - у яго павысіўся ціск і забалела сэрца. У сувязі з гэтым ён папрасіў выклікаць у суд машыну "хуткай дапамогі" і перанесці разгляд справы.

Прыехаўшыя ў суд медыкі правялі абследаванне Фінькевіча, зрабілі хлопцу ўколы і вынеслі свой вердыкт: пасяджэнне можна працягваць.

Адразу пасля гэтага Фінькевіч назваў сваю справу палітычнай.

Падчас допыту Фінькевіч часткова прызнаў сваю віну па вынесеных прадстаўнікамі магілёўскай спецкамендатуры папярэджаннях.

Маладзёжнаму актывісту за час знаходжання "на хіміі" было вынесена некалькі папярэджанняў. Напрыклад, за тое, што ў верасні 2006 года ён без дазволу пакідаў бальніцу, дзе праходзіў курс лячэння. Акрамя таго, 6 студзеня 2007 года Артур, вяртаючыся з адпачынку, спазніўся ў спецкамендатуру на 13 хвілін. Спазненне патлумачыў тым, што таксі, на якім ён ехаў на месца адбывання пакарання, трапіла ў пробку. 16 лютага Фінькевіч ізноў спазніўся. Прычым быў нападпітку. Артур прызнаў, што і сапраўды выпіў тры пляшкі піва...

Сведкамі з боку абвінавачання выступалі супрацоўнікі спецкамендатуры, якія ў сваіх паказаннях рабілі ўпор якраз на вынесеныя маладзёжнаму актывісту папярэджанні.

У сваім апошнім слове Фінькевіч адзначыў: ""Перад вынясеннем прысуду прашу ўлічыць тое, што я часткова прызнаў сваю віну. Прашу ўлічыць перадузятае стаўленне да мяне ў камендатуры і праз гэта мой уласны нервовы стан. Я прызнаю, што часам вёў сябе не зусім тактоўна і правільна. Прашу таксама ўлічыць, што ў мяне ёсць мама і бабуля, якім трэба дапамагаць. Прашу Высокі суд пакараць мяне максімальна мяккім пакаранням - - шасцю месяцамі зняволення".

На такім жа пакаранні для свайго падабароннага настойвала і адвакат Фінькевіча Ганна Рыбалка. У сваю чаргу пракурор Цяплова, якая прадстаўляла на працэсе бок абвінавачання, сказала, што не бачыць ніякіх змякчальных абставін, а таму просіць пакараць Артура Фінькевіча двума гадамі пазбаўлення волі.

Суддзя Наталля Крашкіна асудзіла Фінькевіча на паўтара года зняволення. Гэты прысуд паплечнікі Артура сустрэлі воклічамі "Ганьба!".

Прысуд Фінькевічу будзе абскарджаны ва ўстаноўленым законам парадку. А сам Фінькевіч зараз знаходзіцца ў СІЗА.

Актывіст апазіцыі Вячаслаў Сіўчык, які прысутнічаў на працэсе над Артурам Фінькевічам у размове з "Народнай воляй", адзначыў: "Гэта адзін з самых ганебных, самых гнюсных палітычных судоў, якія мне давялося бачыць за час праўлення Аляксандра Лукашэнкі.

Атрымаць паўтара года зняволення за тры пляшкі піва - гэта дзікунства! Вы ўяўляеце, што такое "хімія"? Там жа кожны другі - хранічны алкаголік.

Увогуле, гэты год аказаўся вельмі складаным для беларускіх палітзняволеных. Быў моцны ціск на Казуліна, прэсавалі Клімава. Зараз вось асудзілі Фінькевіча. Дарэчы, ягонае прозвішча фігуравала сярод тых, каго еўрапейцы заклікалі вызваліць. Аднак прысудам Артуру беларускія ўлады яшчэ раз пацвердзілі, што палітзняволеныя ў краіне ёсць і што вызваляць іх ніхто не збіраецца".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

У ТЭМУ

Справа Фінькевіча не скончана

Ствараемы Аляксандрам Мілінкевічам Рух "За Свабоду" і Камітэт абароны рэпрэсаваных будуць змагацца за вызваленне Артура Фінькевіча.

— Падчас суда над Артурам з'явілася шмат пытанняў да дзеянняў адваката, да выступаў сведкаў з боку пракуратуры. Мы лічым, што адвакат спрацаваў даволі слаба, магчыма, яму нестае досведу. Паказанні сведкаў шмат у чым супярэчаць. Але галоўнае, што Артур Фінькевіч вельмі кепска сябе адчуваў падчас працэсу і не мог у поўнай меры абараняць свае інтарэсы. Ён двойчы хадайнічаў аб пераносе слуханняў, - кажа старшыня грамадскага Камітэта абароны рэпрэсаваных Іна Кулей.

Праваабаронцы знайшлі Артуру новага адваката. З ім ужо складзена дамова. Інтарэсы палітвязня будзе прадстаўляць Ганна Бахціна. Яна будзе складаць касацыйную скаргу ў абласны суд, каб прызнаць прысуд незаконным і патрабаваць перагледзець справу. Падчас паўторнага разгляду адвакат мае намер дабівацца поўнага апраўдання Артура па прычыне яго невінаватасці.

Іна Кулей таксама паведаміла, што Камітэт арганізуе міжнародную кампанію падтрымкі Артура Фінькевіча. Аляксандр Мілінкевіч адзначыў, што рух "За Свабоду" рыхтуе звароты да амбасадараў заходніх краін, а таксама ліст у міжнародную праваабарончую арганізацыю Amnesty International, каб Артура прызналі вязнем сумлення.

Іх лёс хвалюе Беларусь!



Юрый Захаранка
знік 3050 дзён таму

Віктар Ганчар
знік 3018 дзён таму

Анатоль Красоўскі
знік 3018 дзён таму

Дзмітрый Завадскі
знік 2726 дзён таму

Аляксандр Казулін
за кратамі 641 дзень

Зміцер Дашкевіч
за кратамі 467 дзён

Артур Фінькевіч
595 дзён як асуджаны

Мікалай Аўтуховіч
за кратамі 539 дзён

Андрэй Клімаў
за кратамі 267 дзён
(асуджаны ў трэці раз)

ПУЛЬС

Новыя мытныя правілы

Набыў моц указ прэзідэнта "Аб ільготным перамяшчэнні праз мытную мяжу тавараў для асабістага карыстання".

Ён змяняе парадак увозу фізічнымі асобамі некаторых катэгорый тавараў. Так, норма бяспошліннага ўвозу тавараў для асабістага карыстання паменшылася з 50 да 35 кг. Акрамя гэтых 35 кг, фізічная асоба цяпер мае права бяспошлінна ўвозіць да двух літраў алкагольных напояў. Дарэчы, напой лічыцца алкагольным, калі масавая доля этылавага спірту ў ім перавышае 7%, такім чынам абмежаванні на ўвоз піва фактычна знятыя.

Ксёндз вымушаны з'ехаць

У Польшчу быў вымушаны з'ехаць ксёндз Гжэгаж Худэк, які на працягу 14 гадоў служыў у прыходзе касцёла ў Рэчыцы.

Улады яшчэ ў лістападзе адмовілі яму, польскаму грамадзяніну, у працягу рэгістрацыі. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, прычынай гэтага сталі выказванні святара пра сацыяльныя праблемы ў Рэчыцы на старонках польскіх СМІ.

Каля 700 вернікаў падпісалі зварот да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай пакінуць у прыходзе ксяндза Худэка, аднак безвынікова.

Павіншуй палітвязняў са святамі!

Ім цяпер цяжэй, чым нам. Яны пакутуюць за нашу з вамі свабоду. Нашы лісты, паштоўкі, кнігі — гэта маральная падтрымка людзям, якімі ўжо сёння ганарыцца Беларусь. Дык давайце падзякуем ім за гэта і выкажам свае словы падтрымкі.

Аўтуховіч Мікалай
220079, Мінск,
вул.Кальварыйская, 36,
ВК-1, а/с 35, атрад 3

Дашкевіч Зміцер
Шклоў, ВК №17
213004, Магілёўская вобласць

Казулін Аляксандр
Віцебскі раён, пас. Віцьба,
ВК-3, атрад 1
211300, Віцебская вобласць

Клімаў Андрэй
г.Мазыр-11, ВК-20
247760, Гомельская вобласць

Фінькевіч Артур
г.Магілёў, 212011
вул.Крупскай, дом 99а
(следчая турма №4), камера 85

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 СНЕЖНЯ 2007 г.

ГАЗЕТА — ЧИТАТЕЛЬ

«Спасибо “Народной воле” за такой подарок!»

Накануне Нового года всегда ждешь чуда. В нашей профессии добрые истории встречаются независимо от дня календаря. Но почему-то именно в праздничные новогодние дни рассказать о них хочется всем.

После публикации Верховный суд отменил решение нижестоящей судебной инстанции

Несколько лет назад "Народная воля" рассказала о сестрах-сиротах, у которых государство пыталось отобрать однокомнатную квартиру отца. Так получилось, что родители девочек умерли в один год. Мама сгорела от рака, отец умер от туберкулеза, которым страдал несколько лет. Будучи больным, он развелся с женой и жил отдельно от своей семьи в однокомнатной квартире. За несколько дней до смерти мужчина занялся вопросом приватизации квартиры, которую хотел завещать младшей дочери. Девочка к нему была очень привязана и часто жила с отцом в его квартире. Но довести процедуру приватизации до конца он не успел.

Исполкомовские чиновники решили: раз квартира государственная, значит, и принадлежать после смерти хозяина должна государству. О двух несовершеннолетних девочках-сиротах никто не подумал. У сестер ведь осталась квартира, где они проживали с матерью, — крохотная "двушка". Но какое это имело значение для чиновников. Тетя девочек попыталась отстоять права сирот на квартиру через суд. Но и суд не пожелал заглянуть в суть человеческой драмы дальше официальных бумаг, вынес приговор — квартиру оставить государству...

После публикации в нашей газете Верховный суд отменил решения предыдущих судебных инстанций. Чиновники вспомнили о правах детей в нашей стране, и сестрам-сиротам вернули отцовскую квартиру.

«Нам выделили четырехкомнатную квартиру»

В прошлом году за помощью в "Народную волю" обратилась многодетная семья из Минского района. Сергей и Наталья Якубовские с четырьмя детьми более 7 лет жили в здании старой школы, которое нигде не числилось на балансе. В покосившуюся хибару, продуваемую всеми ветрами, без воды, центрального отопления и с удобствами на улице, их когда-то поселили временно, обещая выделить квартиру буквально через пару месяцев. Но нет ничего более постоянного, чем временное.

Глава семейства, как мог, залатал дыры в стенах, полы перестелил, потолки перекрыл, но обветшалая постройка XIX века требовала не ремонта, а сноса. Куда ни обращались Якубовские с просьбой решить жилищный вопрос, везде получали от ворот поворот. С высоких трибун высокопоставленные чиновники громогласно высказывали обеспокоенность демографической ситуацией в стране, а на местах помочь конкретной многодетной семье было некому.

Лед чиновничьего равнодушия растопила наша статья. Буквально через неделю после публикации в "Народной воле" в доме Якубовских раздался телефонный звонок. Звонили из Боровлянского сельского Совета, предложили многодетной семье стать в очередь на квартиру.

"И все так быстро решилось, — Наталья тут же позвонила в редакцию и поделилась своей радостью. —Нам выделили четырехкомнатную квартиру общей площадью 107 квадратных метров в доме, который строился напротив детской областной больницы. Кредит дали льготный — 92 миллиона с 50-процентной скидкой на 40 лет. А ведь за неделю до вашего приезда мы были в сельском Совете, но нам тогда, мягко говоря, указали на дверь".

Новоселье семья Якубовских планирует отметить в январе 2008 года.

«Открыла газету и не смогла сдержать слез»

В августе этого года я случайно узнала, что в Минск на несколько дней приехала со своими внучками дочь героя Советского Союза Веры Хоружей Анна Шляпникова. Именем ее легендарной матери названа одна из центральных улиц Минска. Но что мы знаем о Вере Хоружей, кроме скупых заметок в справочниках и энциклопедиях? Что известно о ее семье? Журналистское любопытство привело меня на улицу Кижеватова, где у своих университетских друзей остановилась Анна Сергеевна Шляпникова.

Интервью с дочерью Веры Хоружей, судя по читательским откликам, получилось интересное. Для меня оно стало особым еще и потому, что благодаря "Народной воле" Анна Сергеевна разыскала свою давнюю подругу Тамару Дубкову.

Судьба так распорядилась, что в 1946 году Анечка Хоружая с младшим братом Сергеем переехала в Москву. В годы Великой Отечественной войны погибла не только их мать Вера Хоружая, в первые дни 1941 года в боях за Пинск погиб и отец — Сергей Гаврилович Корнилов. 6-летнюю Аню и годовалого Сережу взяла на воспитание семья Хоружих. Сначала дети росли в семье тети Нади, потом дяди Василия.

Накануне отъезда в Москву семья Хоружих жила в Минске на улице Энгельса. Аня подружилась с соседской девочкой Томой. Почти двадцать лет подруги переписывались. Анна закончила московскую Тимирязевскую академию, Тамара — Белорусскую государственную консерваторию. Обе вышли замуж. Когда в стране началась перестройка, их переписка прекратилась. А потом женщины и вовсе потерялись.

Анна Шляпникова очень хотела разыскать свою давнюю подругу. Она знала, что Тамара переехала с улицы Берестянской, что у нее изменился номер телефона. Через Мингорсправку, интернет Анна Сергеевна разыскивала Тамару Александровну. Но тщетно. Объявление о том, что дочь Веры Хоружей ищет свою минскую подругу Тамару Дубкову, мы разместили в "Народной воле". И уже на следующий день в редакцию позвонила народная артистка Беларуси Зинаида Бондаренко.

"Тамара Александровна Дубкова — известный в Беларуси человек, — рассказала Зинаида Александровна. — Она заслуженный деятель искусств, лауреат Государственной премии. Я обязательно найду номер ее телефона".

Но буквально в это же время в приемную газеты позвонила и сама Тамара Дубкова.

— Я так благодарна "Народной воле", — голос Тамары Александровны дрожал от волнения. — Сын принес газету, я ее открыла и... не могла сдержать слез.

Я так дорожила нашей дружбой с Аней. Знаю, что это взаимно. Ругала себя за то, что мы расстались на такое длительное время. Ведь ни в моей жизни, ни в Анечкиной не было таких страшных потрясений, которые могли бы нас отдалить друг от друга.

Когда читала материал, вспоминала Аню, как она приезжала ко мне в Минск. Мы стояли у окна моей старой квартиры на улице Берестянской, смотрели на улицу Веры Хоружей — а она открывалась перед нами вся как на ладони — и плакали.

Анна очень светлый человек, дорогой мне. Спасибо "Народной воле" за такой подарок!"

Спустя почти 20 лет подруги снова стали переписываться и регулярно созваниваются. В новом 2008 году Анна Шляпникова и Тамара Дубкова запланировали встретиться. Скорее всего в Минске, в котором они познакомились и подружились. А нам очень приятно, что помогла им в этом "Народная воля"...

Мария ЭЙСМОНТ.

ЧУЛІ?

«Беларускі Хельсінкскі камітэт працуе ў звычайным рэжыме»

Нядаўна ў дачыненні да Міжнароднай Хельсінкскай Федэрацыі распачалася працэдура банкруцтва. Як адзначыў прэзідэнт гэтай арганізацыі Ульрых Фішэр, гэта адбылося "з-за сур'ёзнага фінансавага крызісу МХФ, які выкліканы эканамічным злачынствам. "Былы фінансавы менеджэр федэрацыі затрыманы да суда пасля прызнання ў тым, што ён прысвойваў буйныя сумы грошай цягам некалькіх гадоў. Расследаванне таксама праводзіцца ў дачыненні да двух чалавек, якія не працавалі ў федэрацыі. Суд над імі распачнецца на пачатку студзеня 2008 года", — паведаміў Ульрых Фішэр.

Гэтая інфармацыя выклікала чуткі аб тым, што будзе ліквідаваны і Беларускі Хельсінкскі камітэт, які, дарэчы, на сённяшні дзень з'яўляецца адзінай у Беларусі незалежнай праваабарончай арганізацыяй рэспубліканскага маштабу, якая захавала рэгістрацыю.

Аднак пасля з'яўлення інфармацыі аб крымінальным злачынстве ў Міжнароднай Хельсінкскай Федэрацыі некаторыя сцвярджалі, што Міністэрства юстыцыі Беларусі не прызнае паўнамоцтвы БХК. Аднак гэта не так.

"Праблема крадзяжу грошай у Міжнароднай Хельсінкскай Федэрацыі нас не датычыцца, — сказаў "Народнай волі" старшыня юрыдычнай камісіі Беларускага Хельсінкскага камітэта Гары Паганяйла. — Адзінае, што нам пагражае, дык гэта тое, што магчыма ў звязку з гэтым здарэннем нам могуць "мыць косткі" ў афіцыйных СМІ. Я падкрэсліваю, што БХК зарэгістраваны ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь і , згодна са статутам, з'яўляецца самастойным грамадскім аб'яднаннем. Таму мы будзем працягваць працу ў звычайным рэжыме".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЧУЛІ?

Вялікі распродаж з вялікімі скідкамі

Урадам Беларусі падрыхтаваны праект указа прэзідэнта, прыняцце якога дазволіць прадаваць стратныя прадпрыемствы па цане 20% ад іх балансавага кошту. Пра гэта паведаміў намеснік міністра эканомікі Алег Мельнікаў.

Па інфармацыі спадара Мельнікава, на такіх умовах у 2004—2006 гадах былі прададзены 84 сельгаспрадпрыемствы.

Папярэдні спіс прамысловых прадпрыемстваў, якія могуць быць прададзены за пятую частку балансавага кошту, уключае 200 пазіцый. Праект такога рашэння ўжо падтрыманы Саветам міністраў, і апошняе слова засталося за Аляксандрам Лукашэнкам.

Акрамя таго, Алег Мельнікаў паведаміў, што ўрад таксама прапаноўвае ў малых і сярэдніх гарадах перадаваць частку аб'ектаў у карыстанне без арэнднай платы пры ўмове стварэння на гэтых пляцоўках новых працоўных месцаў, перадае "Інтэрфакс".

Ахвяруй на помнік канцлеру Вялікага княства!

Збор сродкаў на стварэнне помніка канцлеру Вялікага княства Літоўскага Льву Сапегу абвяшчае грамадская арганізацыя "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" ад пачатку 2008 года.

Помнік мяркуецца ўсталяваць у Слоніме, якім Леў Сапега валодаў з 1586 года. Праект помніка падрыхтаваны скульптарам Іванам Міском. Папярэдні кошт складае каля 30 мільёнаў долараў.

Узвядзенне помніка канцлеру ВКЛ запланавана Пастановай Міністэрства культуры на 2006—2010 гады. Таварыства беларускай мовы плануе адкрыць адмысловы банкаўскі рахунак і распачаць збор сродкаў дзеля паскарэння працэсу.

СКАНДАЛЫ-2007

Кожны год у краіне і свеце здараюцца гісторыі, якія трапляюць на першыя старонкі газет і доўга абмяркоўваюцца грамадскасцю. Пра некаторыя з іх мы вырашылі ўспомніць напярэдадні новага, 2008, года.

Казус года

На пачатку лютага міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц і кіраўнік Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч праводзілі прэс-канферэнцыю "Аб пытаннях гарантавання энергабяспекі". Падчас спічу Мясніковіча аб тым, як сэканоміць энергію, замяніць расійскі газ вуглем і г.д. патухла святло.

Прэс-канферэнцыю вырашылі працягваць у іншай зале, дзе пры дзённым святле чыноўнікі прадоўжылі свой аповед, як гарантаваць энергабяспеку беларусаў.

Уцёк года

У красавіку расійская журналістка Алена Трэгубава папрасіла палітычнага прытулку ў Вялікабрытаніі. Аўтар кніг "Байки кремлевского диггера" і "Прощание кремлевского диггера" заявіла, што на радзіме існуе небяспека яе жыццю.

Супадзенне гэта ці не, але Трэгубава, якая некалькі год працавала ў так званым крамлёўскім пуле першага расійскага прэзідэнта Барыса Ельцына, звярнулася да брытанскіх улад з адмысловай заявай амаль адразу пасля смерці Ельцына.

Апошнім часам журналістка жыла ў Англіі, яна пераехала ў Лондан пасля таго, як у 2006 годзе апублікавала ў нямецкай прэсе адкрыты ліст да канцлера Германіі Ангелы Меркель, прысвечаны забойству журналісткі Ганны Паліткоўскай. У ім Трэгубава звярталася да Меркель і іншых заходніх лідэраў з просьбай патрабаваць ад Пуціна спыніць палітычныя забойствы, парушэнні правоў чалавека і ліквідацыю незалежных СМІ ў Расіі.

Трэгубава можа атрымаць палітычны прытулак толькі на пяць год. Па новых правілах, з 1 верасня 2005 года брытанскія ўлады выдаюць часовы дазвол на знаходжанне ў краіне, які дзейнічае пяць год.

Адстаўкі года

10 красавіка нечакана для ўсіх Аляксандр Лукашэнка зняў з займаемай пасады галоўнага ўрача Рэспубліканскай бальніцы Кіравання справамі прэзідэнта Ірыну Абельскую. Раней яна была вядома як лечачы ўрач Лукашэнкі. Абельскую называлі адной з самых уплывовых жанчын беларускай палітыкі.

Кар'ерны ўзлёт доктара Абельскай скончыўся гэтак жа імгненна, як калісьці пачаўся. Пасля звальнення кандыдат медыцынскіх навук Ірына Абельская вярнулася на былое месца працы, у Мінскі дыягнастычны цэнтр. Сёння яна працуе звычайным доктарам у аддзяленні ультрагукавой дыягностыкі.

Яшчэ адна сенсацыйная кадравая перастаноўка ў эшалонах беларускай улады адбылася ў ліпені 2008 года. Лукашэнка сваім загадам адхіліў ад пасады старшыню КДБ Сцяпана Сухарэнку. Генерала, які верай і праўдай, не шкадуючы сябе, служыў Лукашэнку, адправілі ў распараджэнне новага старшыні КДБ. Аднак да гэтага часу — ва ўсялякім разе да 25 снежня 2007 года — Сухарэнка сядзеў без працы. На якія сродкі жыве апальны чэкіст, невядома... Дарэчы, іншаму генералу — Аляксандру Паўлоўскаму, звольненаму з пасады старшыні Камітэта памежных войск увесну 2007 года, месца працы знайшлі. Яго кандыдатуру на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Беларусі ў Францыі ўхваліў парламент. Паўлоўскаму, каб паехаць у Парыж, засталося толькі дачакацца адпаведнага загаду кіраўніка дзяржавы.

Яшчэ адзін кадравы скандал грымнуў у верасні. У адстаўку папрасіўся старшыня Палаты прадстаўнікоў, сябра Аляксандра Лукашэнкі яшчэ са школьскіх часоў, Уладзімір Канаплёў. У сваёй заяве чыноўнік спаслаўся на стан здароўя.

Канаплёў так хуценька знік з поля зроку ўсіх, што чуткі вакол яго адстаўкі хадзілі самыя неверагодныя. Па адной версіі, яе прычына была звязана з галоўным "нафтавым скандалам" гэтага лета — арыштам кіраўніка "Белнафтахіма" і чалавека Канаплёва Аляксандра Бароўскага. Гаварылі нават аб магчымым уцёку Канаплёва за межы Беларусі. Аднак напрыканцы лістапада Канаплёў з'явіўся на пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў, а ў інтэрв'ю нашай газеце распавёў, што ён і далей "будзе з прэзідэнтам".

Затрыманне года

Арыштам высокапастаўленага чыноўніка ў Беларусі сёння нікога не здзівіш. У гэтым годзе такіх затрыманняў было некалькі. У маі супрацоўнікі КДБ затрымалі старшыню дзяржаўнага прадпрыемства "Белнафтахім" Аляксандра Бароўскага. Яго абвінавацілі ў крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў асабліва буйным памеры, наўмысным разгалошванні звестак, якія складаюць службовую тайну. Урон, які, як сцвярджае следства, Бароўскі нанёс дзяржаве, складае не адзін мільён долараў.

Справа Бароўскага пакрыта тайнай. Суд над чыноўнікам павінен пачацца ў сярэдзіне студзеня 2008 года і, магчыма, пройдзе за зачыненымі дзвярыма.

Судовыя слуханні па справе намесніка начальніка ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Холада таксама праходзілі ў зачыненым судовым пасяджэнні. Холада затрымалі ў чэрвені 2007 года і абвінавацілі ў падбухторванні да дачы хабару ў буйным памеры і махлярстве. Сярод гучных спраў года можна ўзгадаць збіццё старшыні Дзяржкантролю Зянона Ломаця, за якое атрымалі рознае пакаранне чатыры прадстаўнікі сілавых структур Беларусі, крымінальную справу супраць кіраўніка "Мінгазу" Віктара Меляшкевіча і судовы прысуд бандзе Марозава.

Намінант года

Былы старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч быў вылучаны на атрыманне Нобелеўскай прэміі. Як толькі навіна дайшла да Беларусі, журналісты першага канала Беларускага тэлебачання выступілі з сенсацыйнай заявай, што Шушкевіч з'яўляецца прыхільнікам забароненай у свеце секты Муна.

Заяву дзяржаўных СМІ Станіслаў Станіслававіч абверг. Прэстыжную прэмію Шушкевіч не атрымаў, але заявіў, што будзе вылучаны на яе і ў новым, 2008, годзе.

Дыскваліфікацыя года

Адзін з самых гучных скандалаў у гісторыі спорту здарыўся ў гэтым годзе і звязаны з допінгам. Знакамітую амерыканскую бягунню Мэрыян Джонс абвінавацілі ў сістэматычным ужыванні забароненых прэпаратаў і ў ілжывых сведчаннях. Спартсменку не толькі дыскваліфікавалі на два гады, Джонс пазбавілі ўсіх узнагарод, якія яна заваявала за апошнія сем гадоў. Гэтым самым спартсменка згубіла адно з самых выдатных дасягненняў у гісторыі лёгкай атлетыкі — на Алімпіядзе ў Сіднеі Джонс заваявала адразу пяць медалёў — тры залатых і два бронзавых.

Рэферэндум года

2 снежня венесуэльскі лідэр Уга Чавес прайграў рэферэндум і магчымасць выбірацца на пасаду прэзідэнта бестэрмінова. Вынікі галасавання ў далёкай лацінаамерыканскай краіне паверглі ў шок увесь свет. Супраць прапановы Чавеса пашырыць прэзідэнцкія паўнамоцтвы выказалася 50,7 працэнта выбаршчыкаў. Усіх у большай ступені здзівілі не лічбы, а тое, што іх агучыў Нацыянальны выбарчы савет Венесуэлы. Няўжо ў Чавеса не было магчымасці скарэкціраваць вынікі рэферэндуму?!

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Справа мазырскіх сатаністаў можа мець працяг

Бацькі асуджанага на 7,5 года пазбаўлення волі за падпал храмаў у Мазыры Цімафея Косіка заяўляюць аб сфабрыкаванасці абвінавачання.

Нагадаем, 14 снежня Мазырскі раённы суд вынес прыгавор па крымінальнай справе ў адносінах да чатырох маладых людзей, жыхароў Мазыра і Калінкавічаў. Двое маладых людзей былі прыгавораны да 7,5 года пазбаўлення волі, адзін непаўналетні і дзяўчына — да 7 гадоў. Яны прызнаны вінаватымі ў падпальванні мясцовай царквы ў гонар Георгія Перамаганосца і рымска-каталіцкага касцёла 18 стагоддзя. Пасля сябе яны пакінулі знакі "666", зоркі і надпісы, што праслаўляюць сатану.

Як паведаміў БелаПАН бацька асуджанага Іван Косік, ён мае звесткі, што яго сына жорстка збівалі міліцыянеры, выбіваючы прызнанне ў падпалах. І.Косік звяртае ўвагу на тое, што універсітэт, дзе вучыўся сын, афіцыйна пацвердзіў алібі свайго студэнта — у час падпалу ён быў на занятках.

"Працэс быў закрытым. Чаму? Толькі на прыгавор запрасілі прадстаўнікоў трох дзяржаўных тэлеканалаў — паказаць, што правасуддзе здзейснілася, вінаватыя пакараны. Апрача таго, у час затрымання Цімафея з яго шыі быў зняты праваслаўны крыжык, а сатаністы, як вядома, знакі хрысціянства не носяць", — зазначыў бацька асуджанага.

Міліцыяй быў праведзены фотаўлік і дактыласкапія больш чым 150 маладых людзей ва ўзросце ад 13 да 20 гадоў, якія збіраліся непадалёку ад спаленага праваслаўнага храма, слухалі рок-музыку. "Фатаграфія майго сына з'явілася ў міліцыі пры расследаванні забойства дзяўчыны "сатаністамі", што адбылося ў Мазыры два гады таму. Цімафей з сябрамі збіраліся непадалёку ад месца забойства, слухалі музыку і размаўлялі. Справа была раскрыта, забойца знойдзены, але ў міліцыі засталася фатаграфія нашага сына. На майго сына проста паказалі пальцам. Праваахоўныя органы хацелі як мага хутчэй раскрыць гучную справу, таму не выбіралі ў метадах доказаў, бралі тых, хто трапіў пад руку", — лічыць бацька асуджанага.

Паводле слоў Івана Косіка, адзін з падследных, малады хлопец, напісаў скаргу ў пракуратуру аб тым, што міліцыянеры дапытвалі яго неправавымі метадамі. "Як вынік — больш да гэтага юнака пытанняў па справе не было, ён праходзіў у судзе як сведка", — зазначыў І.Косік.

Бацькі Цімафея Косіка падрыхтавалі зварот у сродкі масавай інфармацыі, дзяржустановы, да прэзідэнта Беларусі.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

КАЛЕЙДОСКОП

Они удивили мир

Уго ЧАВЕС

Президент Венесуэлы в этом году удивил весь мир. Он ввел собственное время — по всей стране стрелки перевели на 30 минут назад. Чтобы у населения "обмен веществ в головном мозге улучшался в утренние часы благодаря солнечному свету".

Павел ЛАЗАРЕНКО

Бывший премьер Украины попал в десятку самых коррумпированных чиновников мира. Всемирный банк утверждает, что Лазаренко в свое время обогатился аж на 200 миллионов долларов.

Что интересно, в рейтинге жадных хапуг нет ни одного российского коррупционера. Наверное, откупились...

Эрни ЧЕМБЕРС



Американский сенатор подал в суд на Бога. Обвинил Всевышнего в пособничестве террористам и геноциде миллионов жителей Земли. А заодно уж и в насылании стихийных бедствий. Суд штата Небраска иск этот, как ни странно, принял. Но заседание пришлось перенести.

Из-за неявки ответчика...

Михаил СААКАШВИЛИ

Президент Грузии конфисковал у криминальных авторитетов пять особняков на Черноморском побережье. И приказал оборудовать в них санатории для военных и милиции. Простые граждане начальники этой новости очень обрадовались. И только главари бандитов заявили, что это - обыкновенный грабеж!

Борис ГРЫЗЛОВ

Спикер Госдумы России предложил с 1 сентября ввести во всех школах уроки шахмат. По его прикидкам, это повысит успеваемость в среднем на 40 процентов. А если еще картишки ввести...

Ричард ГИР

Голливудский актер поцеловал в Индии местную кинозвезду Шилпу. В щечку. Но поцелуй на улице здесь считается непристойным поведением. Власти сразу выдали ордер на арест мировой звезды кино. Гиру, правда, вовремя удалось смыться из Индии, а то не миновать бы ему огромного штрафа за оскорбление женщины.

Карлос Слим ЭЛЛУ

Мексиканский магнат стал самым богатым человеком планеты. Последние 13 лет таковым считался Билл Гейтс, но в 2007-м они померялись состояниями. И выяснилось, что у Карлоса денег больше на целый миллиард долларов.

Лех КАЧИНЬСКИЙ

Президента Польши изрядно удивила родная дочь Марта, которая вышла замуж за политического оппонента отца. Что ж, любовь зла...

Принц Гарри

Наследник британского престола разыграл августейшую бабушку. При поддержке брата Вилли он записал на автоответчик мобилы Елизаветы Второй смешной текст: "Привет, это Лиз. Меня сейчас нет на троне..." Королева, как сообщают английские СМИ, очень обиделась.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 СНЕЖНЯ 2007 г.

ПРЫЗНАННЕ

Старшыня КДБ ведае апазіцыянераў пайменна

Па звестках КДБ, апазіцыя не пагражае беларускаму рэжыму, улада ў краіне ёй не патрэбна, а жыве яна за кошт грантаў і яшчэ да таго ж абірае "нашых "свядомых".

Як паведамляе Інтэрфакс, аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіў старшыня КДБ Беларусі Юрый Жадобін.

"У так званую супольнасць дэструктыўных элементаў уваходзіць усяго 1767 асоб. Мы іх усіх ведаем пайменна, па прозвішчах, і іх не становіцца ні больш, ні менш", — сказаў Жадобін.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Спіс яшчэ пішацца

Як вядома, у наступным годзе ў нашай краіне пройдуць парламенцкія выбары. Шмат гаварылася пра тое, што ў дэмакратаў будзе адзіны спіс кандыдатаў. Але ці ўдалося дагаварыцца?

Марына Рак,
г.Віцебск.

Пакуль адзінага спісу няма, але лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька па-ранейшаму абяцае, што "да канца гэтага года ў аб'яднаных дэмакратычных сіл будзе стройны адзіны спіс".

Паводле яго слоў, ужо ўдакладнены кандыдаты па больш чым палове выбарчых округ. Прыкладна па 45 са 110 округ яшчэ неабходна ўзгадніць адзінага кандыдата.

Анатоль Лябедзька паведаміў, што ўжо на гэтым тыдні збяруцца сустаршыні АДС, каб вызначыць кандыдатаў па кожнай акрузе. "Да канца года спіс павінен быць максімальна набліжаны да прынцыпу "адна акруга — адзін кандыдат", — падкрэсліў палітык. Пры гэтым ён зазначыў, што некалькі округ могуць застацца без кандыдата ад АДС.

Анатоль Лябедзька прызнаўся, што прэзідыум Палітсавета АДС ужо мог бы "валявым рашэннем зацвердзіць адзіны спіс". "Але мы не робім гэтага, бо нам важная каманда. Адзіны спіс неабходна распрацоўваць і зацвярджаць кааліцыйна", — сказаў лідэр АГП.

Нагадаем, што аптымальнай датай правядзення чарговых парламенцкіх выбараў Цэнтрвыбаркам называе 12 кастрычніка 2008 года.

Алег СНОЎ.

ПОЛИТИЧЕСКИЕ ДИАЛОГИ:

Вячеслав ОРГИШ — Павел ШЕРЕМЕТ

Форточка для оппозиции,

или О том, почему нашу судьбу могут решить в Брюсселе и Москве

Смена настроений и акцентов в белорусско-российских отношениях, последовавшая за нефтегазовыми разборками Москвы и Минска, в конечном счете сформировала новую ситуацию как для белорусской власти, так и для белорусской оппозиции.
И та, и другая, по-разному воспринимая и оценивая перспективу и значение западного вектора для Беларуси, признают его актуальность. И та, и другая, по-разному относясь к России как фактору белорусской политики, не могут игнорировать то обстоятельство, что ключи к ряду проблем, которые предстоит решать, находятся не в Брюсселе, а в Москве. При этом ни белорусский режим, ни его демократические противники не могут похвастаться тем, что вооружены эффективной стратегией, которая позволит им успешно справиться с новыми вызовами. Об этом окончание беседы Павла Шеремета и Вячеслава Оргиша.

(Окончание. Начало в №№193—194.)

НИКАКОГО ВРАГА У ВОРОТ НЕТ

— Павел, быть может, правы те, кто ставит вопрос так: надо выдвигать на передний план не геополитическую ориентацию Беларуси (западную или восточную), а ставить во главу угла вопрос о формировании и укреплении суверенного государства, независимой нации.

— Нельзя строить политику оппозиции, исходя из внешнего фактора. Когда идет война, когда агрессор у ворот, тогда требуется мобилизация народа для борьбы с внешним врагом. Такой мобилизацией сейчас занимается Лукашенко. Он сознательно раскручивает антироссийские настроения, как раньше раскручивал антизападные. Он кричит о том, что враг у ворот — мобилизуемся, а для этого терпим меня еще 15 лет, терпим мое КГБ, мое МВД, мою дурацкую советскую экономику, терпим моих сыновей (потому что враг у ворот). По-видимому дружественный визит Путина в Минск вряд ли радикально поколебал мобилизационную схему Лукашенко. Для оппозиции, если она хочет обойти в этом вопросе своего противника, никакого врага у ворот нет. Она должна заниматься мобилизацией людей с помощью внутренних лозунгов, призывающих к изменению социальной жизни. И чем больше будет между Россией и Беларусью клинч по ценам на газ, тем большую роль будет играть социальный фактор. Сейчас мы видим, что белорусские предприятия начинают проигрывать в конкуренции на российском рынке...

— Начинают терять российский рынок…

— Совершенно верно, а западный — не могут завоевать. Будет нарастать масса социальных проблем, которые оппозиции нужно педалировать в пропагандистской борьбе. Потом нельзя молчать по поводу чиновничьего, милицейского беспредела. Надо поднимать тему клановости, передачи власти сыновьям, добиваться правды о пропавших политиках. А затем уже вбрасывать тему европейской ориентации. Но не в том смысле, что завтра мы должны вступить в Евросоюз, а в том смысле, что у нас должно быть как в Европе, где нет такой коррупции, беспредела чиновников, милиции, свободные выборы, свободные СМИ.

— Когда Лукашенко говорил об интеграции Беларуси и России, то вольно или невольно всплывала идея полного вхождения Беларуси в состав России (чему там были бы очень рады). Иначе говоря, под угрозой оказывался белорусский суверенитет. Европейское сообщество — по определению сообщество свободных, безусловно независимых государств. Быть может, эта принципиальная разница должна стать предметом и обсуждения, и некоего публичного разъяснения в рамках той идеологии, которую оппозиции сегодня надо поднимать на щит?

— Нельзя оппозиции лезть в отношения с Россией, потому что у нее там заведомо слабая позиция. Отношения с Россией — это карта в руках Лукашенко, он как захочет, так завтра и использует ее. Сегодня он спорит с Россией, завтра захочет — сдаст белорусов с потрохами Москве. Он играет этой темой, как котенок играет шариком. А оппозиция ничего не может противопоставить этому.

— Дело в том, что оппозиция вынуждена эту тему проговаривать в своей публичной деятельности. Стало быть, ее надо осмысливать, формулировать и представлять общественности в виде послания.

— Да, об этом надо думать все время. Когда я ставлю себя на место лидеров белорусской оппозиции, я не могу четко сформулировать такое послание в виде предвыборных лозунгов. Но мне кажется, что в философии активного нейтралитета (и с Польшей, и с Россией) имеется значительное рациональное зерно. Синицын прав в том, что часть белорусского общества пугает польское влияние. Всегда найдутся люди, историки, политологи, идеологи, которые достаточно аргументированно объяснят белорусским гражданам, в чем опасность польского влияния. И покажут, как на ранних стадиях нашей истории поляки уничтожали белорусскую идентичность. Потом появятся историки, которые покажут, как на поздней стадии белорусской истории русские уничтожали, добивали белорусскую идентичность. Поэтому если, скажем, какая-то часть людей будет педалировать исключительно польский или русский вопрос, то это ничего, кроме раскола в обществе, не принесет. И развалит конструкцию европейской интеграции... Вот БНФ, белорусские националисты, они что, не чувствуют опасности польского влияния? Почему они выступают против России, но не выступают, например, против Польши? Ведь по идее националисты выступают против всех соседей, которые угрожают национальной идентичности. Вон братья Качиньские ненавидят Германию не меньше, чем Россию...

— Вопрос о том, как противостоять полонизации, сегодня стоит не так остро, как проблема русификации.

— Но как во времена Пилсудского, так и сейчас, при Качиньском, Польша не испытывает восторга от того, что к Беларуси надо относиться как к самостоятельной стране и международному партнеру. И поляки, и русские рассматривают нас как буфер в отношениях между собой.

ДИАЛОГ ИЛИ ВСЕ-ТАКИ ПРЕДАТЕЛЬСТВО?

— А кто может стать буфером на пути России, если она захочет довести тему поглощения Беларуси до конца? Все-таки где-то идея поглощения Беларуси живет. Имперский дух, как вы сами заметили выше, толкает российских политиков к тому, чтобы подтягивать, подгребать Беларусь все ближе и ближе, пока она не свалится в закрома РФ. На прошедшем 22—25 ноября "Минском форуме X" с участием немецких и белорусских государственных чиновников, экспертов, политиков прозвучала весьма тревожная информация. За последнее время число российских фирм, пришедших в Беларусь, выросло в десять раз, западные фирмы по этому показателю далеко позади.

— Буфера нет. Если Лукашенко захочет, он завтра сдаст Беларусь. Но опасность невелика (ее преувеличивают), потому что у России нет ресурсов для поглощения Беларуси, и ей это сейчас не надо. России достаточно контролировать здесь несколько секторов: нефтегазовый транзит, финансовую систему и точечно ряд отраслей народного хозяйства. Больше ей ничего от Беларуси не надо.

— К сожалению, у оппозиции нет выверенной концепции того, как строить взаимоотношения Беларуси и России. Лидеры и эксперты все еще спорят о том, чего хотят российские политические и экономические элиты в Беларуси. Белорусская оппозиция до сих пор внятно не сформировала свой меседж российским политическим и экономическим контрагентам. В отличие от Лукашенко, она не может сказать, насколько и каким образом готова учитывать интересы российской политики и бизнеса.

— Проблема заключается в том, что идеологи белорусской оппозиции не сформулировали четкое видение Беларуси без Лукашенко как для российских, так и для западных партнеров. Лидеры белорусской оппозиции не готовы к серьезному разговору, например, с Германией по поводу газа. Когда в лоб задается вопрос, что будет после Лукашенко с ценами на газ, с газовым транзитом и так далее, то белорусская оппозиция не дает четкого, обоснованного и выгодного для немецких потребителей делового ответа. Она начинает рисовать какие-то круги на воде, забывая о том, что российский газ продан в Германию уже на 20 лет вперед. В итоге выясняется, что для немцев лучше понятный ответ Лукашенко, чем непонятный ответ оппозиции, которая собирается быть у власти после него. То же — с россиянами. На самом деле интересы российского бизнеса очень простые и понятные — бесперебойные условия нефтегазового транзита, контроль над определенными отраслями народного хозяйства, доступ к приватизации промышленности и к ряду новых инвестиционных проектов в Беларуси.

— Контроль над основными экономическими объектами является предпосылкой для безусловного контроля в политической сфере.

— Это было 50 лет назад. Сейчас это не так. Если немцы владеют заводом "МАЗ", то это не значит, что они владеют белорусским государством.

— "МАЗ" составляет, условно говоря, 5% белорусской экономики. Но когда владение достигает 55—60%, когда в чьи-то руки попадает контрольный пакет акций, начинается совсем иная песня. Неспроста после визита Путина в Минск, его финансовых "щедрот", независимые эксперты вновь взялись обсуждать веротятную схему российской экономической экспансии. Сначала Москва кредитует белорусскую сторону, помогает ей залезть в долговую яму, а затем требует обменять долговые обязательства на активы промышленных предприятий.

